ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

● № 15 (772) ● Пятніца, 24 красавіка 1970 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

Запрашае універсітэт

Сённяшні нумар нашай газеты прысвячаецца тым, хто выбірае дарогу ў самастойнае жыццё, каго прыцягваюць нязведаныя таямніцы навукі, хто імкнецца стаць высокакваліфікаваным спецыялістам, каб пасля прынесці найбольшую карысць народу.

Вы даведаецеся аб гісторыі універсітэта, аб усіх яго факультэтах, аб спецыфіцы навучання ў вышэйшай школе. БДУ чакае вас, дапытлівых, настойлівых, працавітых.

ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Беларускі дзяржаўны універсітэт з гонарам носіць імя Уладзіміра Ільіча Леніна, прысвоенае яму 1 студзеня 1949 года у дзень трыццацігоддзя з дня ўтварэння БССР. З імем У. І. Леніна звязана і гісторыя стварэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1919 годзе быў апублікаваны падпісаны У. І. Леніным дэкрэт Савета Народных Камісараў аб заснаванні шэрагу універсітэтаў. Адпаведна гэтаму дэкрэту і быў створаны БДУ. 30 кастрычніка 1921 года адбылося яго урачыстае адкрыццё і пачаліся рэгулярныя заняткі.

У лютым 1925 года універсітэт даў рэспубліцы першы атрад спецыялістаў.

З году у год расла колькасць студэнтаў, ствараліся новыя факультэты, расшыралася вучэбна-матэрыяльная база. Адкрыццё пры універсітэце аспірантуры садзейнічала больш паспяховаму рашэнню задачы па падрыхтоўцы нацыянальных навуковых і выкладчыцкіх кадраў. Да 1930 года у штаце універсітэта налічвалася ужо больш 300 навуковых работнікаў. У 1931 годзе было закончана будаўніцтва універсітэцкага гарадка.

Дзякуючы пастаянным клопатам партыі і урада Беларускі дзяржаўны універсітэт стаў буйным навуковым і вучэбным цэнтрам па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для усіх галін народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі і заняў вядучае месца у развіцці вышэйшай адукацыі у Беларусі. На базе яго факультэтаў былі створаны буйнейшыя вышэйшыя навучальныя установы Савецкай Беларусі: Мінскі медыцынскі інстытут (1930 г.), інстытут народнай гаспадаркі імя Куйбышава (1931 г.), політэхнічны інстытут (1933 г.), педагагічны інстытут імя Горкага. Універсітэцкая фундаментальная бібліятэка была пераутворана у Дзяржаўную бібліятэку імя У. І. Леніна. Як старэйшая навукова-даследчая установа рэспублікі Беларускі дзяржаўны універсітэт унёс свой уклад у стварэнне Акадэміі навук БССР.

Адначасова з арганізацыяй новых навучальных устаноў ствараліся і новыя факультэты ва універсітэце. У 1934 годзе былі адкрыты гістарычны і геаграфічны, а у 1938-39 навучальным годзе — філалагічны факультэт.

Вераломнае нападзенне гітлераўскіх захопнікаў на нашу Радзіму перарвала работу БДУ. Універсітэцкі гарадок быў падвергнуты бамбардзіроўцы. Фашысты разбурылі і знішчылі каштоўнае вучэбна-навуковае абсталяванне, музей, аранжарэю, архівы, вучэбныя карпусы, інтэрнаты. Але і у гэты цяжкі для Радзімы час Камуністычная партыя і Савецкі ўрад праявілі выключна вялікія клопаты аб Беларускім дзяржаўным універсітэце.

15 мая 1943 года у ваенных умовах Савет Народных Камісараў прыняў пастанову аб аднаўленні работы універсітэта на станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгункі. Тады пачалі працаваць фізіка-матэматычны, хімічны, біялагічны, геаграфічны, гістарычны, філалагічны факультэты. А з 1 жніўня 1944 года універсітэт абасноваўся ужо у Мінску.

У 1945-46 навучальным годзе ва універсітэце вучылася усяго 896 студэнтаў. У наступныя гады колькасць студэнтаў няспынна павялічвалася, аднаўлялася і пашыралася вучэбна-вытворчая база.

У 1969-70 навучальным годзе ва універсітэце вучыцца 16500 студэнтаў, у тым ліку больш 300 замежных грамадзян з 21 краіны. Універсітэт мае факультэты: фізічны, матэматычны, прыкладной матэматыкі, хімічны, біялагічны, геаграфічны, гістарычны, юрыдычны, філалагічны, журналістыкі, падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян, завочны факультэт.

Падрыхтоўка кадраў ажыццяўляецца па 15 спецыяльнасцях і 44 спецыялізацыях.

Матэрыяльна-тэхнічную базу БДУ складаюць 6 вучэбных карпусоў, 6 інтэрнатаў, вылічальны цэнтр, бібліятэка, якая налічвае больш мільёна тамоў. Ёсць ва універсітэце свая друкарня і выдавецтва, 4 спартыўныя залы, гістарычны, археалагічны, мінералагічны і заалагічны музеі, станцыя візуальнага назірання за штучнымі спадарожнікамі Зямлі, біястанцыя, аранжарэя і г. д.

Вучэбную і навуковую работу вядуць 85 кафедр і шэраг праблемных лабараторый, дзе працуюць 1033 выкладчыкі, у тым ліку 4 акадэмікі, 11 членаў-карэспандэнтаў АН БССР і Акадэміі педагагічных навук СССР, больш 50 прафесараў, дактароў навук, каля 400 кандыдатаў навук.

Партыйная арганізацыя БДУ налічвае у сваіх радах 853 камуністы; 8896 членаў ВЛКСМ аб'ядноўвае камсамольская арганізацыя універсітэта.

З 1921 па 1969 год БДУ падрыхтаваў 26392 спецыялісты і 966 аспірантаў. У далейшым штогадовы выпуск складзе 2,5 тысячы маладых спецыялістаў.

Для далейшага развіцця і ўмацавання вучэбнай і навукова-эксперыментальнай базы ужо у 1970 годзе на базе праблемных і навукова-даследчых лабараторый фізічнага профілю будзе створаны навукова-даследчы інстытут прыкладной фізікі, а у 1971—1975 гадах—навукова-даследчыя інстытуты матэматыкі, хіміі, біялогіі. Значныя капітальныя укладанні будуць затрачаны на будаўніцтва у 1971—1973 гадах новых інтэрнатаў для студэнтаў і аспірантаў.

За вялікія заслугі у падрыхтоўцы спецыялістаў і развіцці навукі вялікая група вучоных універсітэта у 1961 годзе была узнагароджана ордэнамі і медалямі СССР, Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 7 студзеня 1967 года Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. 16 снежня 1968 года універсітэт удастоен Памятнага сцяга ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаюпрофа. А 20 красавіка сёлетняга года яму уручана Ленінская юбілейная ганаровая грамата.

Кожны студэнцкі дзень насычан напружанай і цікавай працай. На лекцыях і семінарскіх занятках, у кабінетах і лабараторыях здабываецца каштоўнейшы капітал—веды.

НА ЗДЫМКУ: студэнты IV курса фізфака слухаюць лекцыю па радыёфізіцы. *Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

ХІМІЧН

Лепшыя выпускнікі хімічнага факультэта пасля заканчэння аспірантуры застаюцца ва універсітэце і з поспехам працягваюць свае навуковыя пошукі.
НА ЗДЫМКУ: нядаўняя выпускніца аспірантуры Г. І. Абражэвіч праводзіць чарговы доследа.

Хімічны факультэт універсітэта з'яўляецца адзіным у рэспубліцы, дзе рыхтуюцца высокакваліфікаваныя кадры хімікаў для работы ў навукова-даследчых і заводскіх лабараторыях, у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах і сярэдніх школах. Адна з асноўных асаблівасцей навучання на хімічным факультэце заключаецца ў тым, што вывучэнне ўсіх хімічных дысцыплін тут вядзецца на шырокай фізіка-матэматычнай аснове, і галоўны ўпор робіцца на тэарэтычныя асновы хіміі, вывучэнне якіх немагчыма без глыбокіх ведаў адпаведных раздзелаў вышэйшай матэматыкі, фізікі і квантавай механікі.

Разам з глыбокай тэарэтычнай падрыхтоўкай студэнты-хімікі значную частку вучэбнага часу праводзяць у хімічных лабараторыях, дзе засвойваюць прыёмы і метады эксперыментальнай работы, замацоўваючы тэарэтычныя веды.

У сувязі з пераходам у новы корпус значна пашырылася лабараторная база хімічнага факультэта, навейшым абсталяваннем папоўніліся лабараторыі. Цяпер на факультэце ёсць прыборы, якія дазваляюць вывучаць інфракрасныя спектры, спектры электроннага парамагнітнага і ядзернага рэзанансу рэчываў, а таксама электронныя мікраскопы, рэнтгенаўскія ўсганоўкі і іншыя прыборы.

Па жад ведна інтарэсам канцы навучання юцца ў адной з іх га-лін хіміі.

У цяперашні час факультэт рыхтуе хімікаў па дзевяці спецыялізацыях: неарганічнай, арганічнай, аналітычнай, фізічнай хіміі, хіміі паўправадніковых рэчываў, хіміі высокапалімераў, хіміі нафты, радыё- і радыяцыйнай хіміі і будовы рэчыва.

Заканчваецца вучоба студэнтаў вытворчай практыкай на перадавых хімічных прадпрыемствах рэспублікі або ў навукова-даследчых установах і педагагічнай практыкай у школах.

У працэсе навучання студэнты маюць магчымасць прымаць непасрэдны ўдзел у навукова-даследчых работах, якія праводзяцца на кафедрах факультэта. Гэта, напэўна, адна з самых цікавых старонак студэнцкага жыцця, калі студэнт сам становіцца тварцом навукі.

Хімія сённяшняга дня — гэта навука, якая ўвабрала ў сябе навейшыя дасягненні матэматыкі, фізікі і біялогіі. У сваю чаргу развіццё хіміі садзейнічае развіццю біялогіі і фізікі. Роля хіміі ў народнай гаспадарцы і ў развіцці сучаснага грамадства агульнавядома. Нам думаецца, што той, хто выбера сваёй спецыяльнасцю хімію, не пашкадуе аб гэтым.

Ф. КАПУЦКІ,
дэкан хімічнага факультэта, дацэнт.

ГЕАГРАФІЧНЫ

За гады існавання факультэт выпусціў тысячы маладых спецыялістаў. Яны плённа працуюць цяпер у самых розных галінах гаспадаркі, культуры, навукі. Выпускнікоу факультэта можна сустрэць ва установах гідраметслужбы і геалогіі, аховы прыроды і на геадэзічных прадпрыемствах, у школах і навуковых установах.

На сямі спецыяльных кафедрах працуюць акадэмікі і члены-карэспандэнты АН БССР, прафесары і дактары навук, дацэнты, выкладчыкі, вядомыя сваімі працамі у галіне геалогіі, геахіміі, эканамічнай і фізічнай геаграфіі, глебазнаўства, метэаралогіі і іншых навук аб Зямлі. У саставе факультэта ёсць навукова-даследчая лабараторыя азёразнаўства, лабараторыя глебавай біяхіміі, у рабоце якіх актыуна удзельнічаюць студэнты.

Вялікая і сапрауды бязмежная галіна прымянення геолага-геаграфічных навук. Перад будучымі даследчыкамі Зямлі — бясконцыя магчымасці навуковых пошукаў і пераутварэнняў. Да нашых дзён амаль не даследаваны шырокія прасторы і глыбіні акіянаў, якія займаюць больш паловы зямнога шара, вельмі мала ведаем мы пакуль што аб паветраным акіяне, дзе утвараюцца клімат і надвор'е нашай Зямлі.

Толькі цяпер чалавек пачынае пранікаць у нетры зямлі, у верхнія слаі зямной кары. Што знаходзіцца глыбей, дзе прычына землетрасенняў, як утвараюцца рудныя месцанараджэнні, нафта і іншыя выкапні — адказы на гэтыя пытанні могуць даць тыя, хто будзе вывучаць навукі аб Зямлі, карыстаючыся сучаснымі навуковымі метадамі даследавання.

Асабліва вялікія задачы стаяць перад геграфамі у справе планамернай аховы і выкарыстання прыродных рэсурсаў. Ахова прыроды — перш за усё справа геаграфічнай навукі.

Вялікія магчымасці геаграфічных навук і у Беларусі.

Геаграфічны факультэт заусёды прыцягвае тых, хто любіць рамантыку далёкіх дарог, шукае новыя шляхі у неабсяжных прасторах нашай Радзімы.

М. РАМАНОЎСКІ,
дэкан геаграфічнага факультэта, дацэнт.

ЖУРНАЛІСТЫКІ

Стварэнне факультэта журналістыкі у цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны (1944 г.) з'явілася доказам вялікай увагі і клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага урада аб уздыме культуры беларускага народа, аб яго высокай ідэйнасці, адданасці справе вялікага Леніна.

Для спецыяльнай падрыхтоўкі журналістаў была утворана кафедра тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку. У 1944 г. пачалі вучобу студэнты I, II і III курсаў, у большасці сваёй гэта былыя студэнты КіЖа. У 1946 годзе навучаліся ужо 143 чалавекі.

Звыш 90 працэнтаў студэнтаў пасляваенных год складалі дэмабілізаваныя воіны, многія мелі вопыт газетнай работы. Першыя 11 журналістаў былі выпушчаны у 1948 годзе. А за усе гады факультэт падрыхтаваў звыш 1100 журналістаў, якія працуюць амаль ва усіх шматтыражках, раённых, абласных і рэспубліканскіх газетах, на радыё і тэлебачанні і у кніжных выдавецтвах.

З году у год факультэт рос і пашыраўся. Да 1961 года на ім была толькі адна кафедра — тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку, у веданні якой былі усе журналісцкія дысцыпліны. Цяпер працуе чатыры кафедры: гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання. Стварэнне новых кафедр дазволіла палепшыць якасць падрыхтоўкі журналістаў і разгарнуць навукова-даследчую працу.

Вучэбны план разлічан на пяцігадовы тэрмін навучання. У ім прадугледжваецца значная колькасць гадзін па гісторыі КПСС, палітэканоміі, дыялектычнаму і гістарычнаму матэрыялізму, гісторыі філасофіі, гісторыі БССР.

Многа увагі удзяляецца моўным дысцыплінам і літаратуры. Студэнты вывучаюць сучасныя рускую і беларускую мовы, рускі і беларускі фальклор, тэорыю літаратуры, гісторыю рускай і беларускай літаратуры, гісторыю зарубежнай літаратуры, адну з замежных моў. Асаблівая увага надаецца вывучэнню беларускай мовы, бо пасля заканчэння факультэта журналістыкі выпускнікі яго ідуць працаваць у рэдакцыі беларускіх газет, на радыё і тэлебачанне, перадачы якіх вядуцца на беларускай мове.

Значнае месца адводзіцца прафесіянай падрыхтоўцы будучых работнікаў друку, радыё і тэлебачання. Шмат гадзін у плане адводзіцца тэорыі і практыцы партыйна-савецкага друку, стылістыцы і літаратурнаму рэдагаванню, спецкурсам і спецсемінарам. Студэнты вывучаюць таксама эканоміку прамысловасці і сельскай гаспадаркі, дэталёва знаёмяцца з публіцыстычнай дзейнасцю Маркса, Энгельса, Леніна, а таксама публіцыстаў ленінскай школы.

Студэнты-журналісты вывучаюць машынапіс і фотасправу.

Выкладчыцкую работу па прафіліруючых дысцыплінах вядуць высокакваліфікаваныя спецыялісты: прафесары, дацэнты, старшыя выкладчыкі і выкладчыкі. Вучэбная і вытворчая практыка у рэдакцыях газет, радыё і тэлебачання з'яўляецца неад'емнай часткай усяго навучальнага працэсу.

У працэсе падрыхтоўкі журналістаў вялікую ролю адыгрываюць студэнцкія навуковыя гурткі па гісторыі журналістыкі, публіцыстыцы ленінскай школы і сучаснай публіцыстыцы, радыё і тэлебачанню, якія аб'яднаны у студэнцкае навуковае таварыства. Яно часта сумесна з дэканатам арганізуе сустрэчы з вядомымі публіцыстамі, работнікамі цэнтральных, рэспубліканскіх, абласных і раённых газет, радыё і тэлебачання. Акрамя гэтага, студэнцкае навуковае таварыства выпускае альманах «Творчасць журналіста», у якім друкуюцца навуковыя працы, мастацкія і публіцыстычныя творы студэнтаў у розных жанрах—апавяданні, фельетоны, фотарэпартажы, вершы, нарысы, гумарэскі і г. д.

Р. БУЛАЦКІ,
дэкан факультэта журналістыкі, дацэнт.

БІЯЛАГІЧНЫ



НА ЗДЫМКУ: спецпрактыкум па фізіялогіі чалавека і жывёл праводзяць студэнты-завочнікі шостага курса аддзялення біялогіі. *Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

Паспяховае развіццё сучаснай біялогіі у нашай краіне не толькі падрыхтавана, але і прадвызначана бліскучымі поспехамі сумежных навук: фізікі, хіміі і матэматыкі.

Перспектывы многіх раздзелаў біялогіі ужо у цяперашні час настолькі вялікія, што можна гаварыць аб наступленні новай эры у развіцці гэтай навукі.

Сучасная біялогія, узброеная шырокімі ведамі у галіне арганізацыі жывой матэрыі і забяспечаная дакладнай вымяральнай і павелічальнай апаратурай, актыўна шукае падрамкі да рашэння такіх праблем, як кіраванне спадчыннасцю, рэгуляванне працэсаў росту і развіцця арганізмаў, авалоданне механізмамі фотасінтэзу і павышэння прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі, разгадкі малекулярных асноў жыцця і іншае.

Таму перад біялагічным факультэтам БДУ імя У. І. Леніна ставіцца задача падрыхтоўкі спецыялістаў-біялагаў, здольных рашаць такія складаныя і адказныя задачы.

Вучэбныя заняткі на факультэце праходзяць у выглядзе лекцый, а таксама лабараторных і практычных заняткаў у лабараторыях і навукова-вучэбных базах.

На першым і другім курсах студэнты вывучаюць агульнаэіялагічныя дысцыпліны. З трэцяга курса пачынаецца спецыялізацыя па наступных раздзелах біялогіі: генетыка і цыталогія, фізіялогія раслін, мікрабіялогія і вірусалогія, сістэматыка раслін, заалогія беспазваночных (гідрабіялогія і энтамалогія), заалогія пазваночных, фізіялогія чалавека і жывёл, біяхімія жывёл і біяфізіка.

Вытворчую практыку студэнты праходзяць, удзельнічаючы у розных экспедыцыях, на вопытных станцыях, у лабараторыях інстытутаў Акадэміі навук БССР, у запаведніках, у саугасах і калгасах.

Закончыўшыя біялагічны факультэт накіроўваюцца на работу у навукова-даследчыя установы, у запаведнікі, на біялагічныя станцыі, а таксама ў сярэднія спецыяльныя навучальныя установы і сярэднія школы.

Біялагічны факультэт мае вучэбную станцыю на возеры Нарач і вучэбную гаспадарку у Шчамысліцы, заалагічны музей, батанічны сад і аранжарэю.

Уся вучэбна-навуковая работа на факультэце здзяйсняецца васьмю кафедрамі: фізіялогіі раслін, дарвінізма і генетыкі, сістэматыкі раслін, заалогіі беспазваночных жывёл, заалогіі пазваночных, фізіялогіі чалавека і жывёл, мікрабіялогіі, біяхіміі і біяфізікі. Імі кіруюць буйныя вучоныя, вядомыя за межамі рэспублікі і Савецкага Саюза.

Калектывы кафедр і комплексная праблемная лабараторыі эксперыментальнай біялогіі паспяхова распрацоўваюць шэраг важных навуковых праблем: фотасінтэз, спажыванне і рост раслін, кіраванне спадчыннасцю арганізмаў, селекцыя важнейшых сельскагаспадарчых культур, хваробы сельскагаспадарчых раслін і распрацоўка мер барацьбы з імі, электрафізіялагічныя метады даследавання фізіялогіі чалавека і жывёл, пытанні сельскагаспадарчай і медыцынскай мікрабіялогіі і вірусалогіі і іншыя. Да работы над гэтымі навуковымі праблемамі прыцягваюцца і студэнты.

П. ПЯТРОВІЧ,
дэкан біялагічнага факультэта, дацэнт.

ФІЗІЧНЫ

У нашай краіне з году у год расце запатрабаванне на спецыялістаў-фізікаў. І гэта зразумела: фізіка ляжыць у аснове тэхнікі, яна цесна звязана з далейшым навукова-тэхнічным прагрэсам усёй народнай гаспадаркі. Няма цяпер такой галіны прамысловасці, дзе б не працавалі фізікі самых розных спецыяльнасцей і профілю.

Фізіка — навука пярэдняга краю, навука-разведчык, межы якой ляжаць у галіне фантастыкі, часам — подзвігу. І тым, хто прыйдзе сёння ў фізіку, тым, хто збіраецца выбраць сабе дарогу у жыццё, мне хочацца сказаць, што гэта навука настолькі цікавая, як і цяжкая.

Фізічны факультэт нашага універсітэта рыхтуе фізікаў-даследчыкаў шырокага профілю па дзвюх спецыяльнасцях — радыёфізіка і электроніка, а таксама фізіка са спецыялізацыямі па дзесяці важнейшых галінах: тэарэтычная фізіка, оптыка і спектраскапія, біяфізіка, фізіка ядзерных энергетычных установак, ядзерная фізіка, фізіка паўправаднікоў, фізіка цвёрдага цела, цеплафізіка, педагагічная спецыяльнасць і іншыя. Натуральна, што падрыхтоўка спецыялістаў такога шырокага кола патрабуе і наяўнасці высококваліфікаваных педагагічных кадраў, а таксама багатай навукова-тэхнічнай і лабараторнай базы. Усё гэта ў нас ёсць. Навуковы калектыў факультэта складаюць каля 400 чалавек, у тым ліку каля 20 прафесараў і дактароў навук, больш 70 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Сярод іх відныя вучоныя прафесары А. Н. Сеўчанка, Л. В. Валадзько, Ф. І. Фёдараў, У. Г. Вафіядзі, М. А. Ельяшэвіч, І. Р. Некрашэвіч, В. Д. Ткачоў, Ю. С. Багданаў і многія іншыя, чые навуковыя даследаванні шырока вядомы не толькі у нашай рэспубліцы і краіне, але і далека за яе межамі. Гэты вялікі калектыў прафесараў, дактароў, дацэнтаў, кандыдатаў фізіка-матэматычных навук, выкладчыкаў і асістэнтаў аб'ядноўвае на факультэце 15 кафедр, шэраг праблемных і навукова-даследчых лабараторый.

Па колькасці студэнтаў фізічны факультэт буйнейшы ва універсітэце. Толькі дзённай формай навучання ахоплена каля 2000 і вячэрняй. — каля 600 студэнтаў. Акрамя таго, на факультэце вучыцца многа замежных студэнтаў з краін Афрыкі і Азіі.

Цесная творчая сувязь факультэта з многімі інстытутамі фізічнага, фізіка-тэхнічнага профілю, такімі, як інстытут фізікі, інстытут цепла- і масаабмену, інстытут ядзернай энергетыкі, фізіка-тэхнічны інстытут, інстытут паўправаднікоў, і іншымі дазваляе выкарыстаць лабараторную базу і кадры гэтых інстытутаў не толькі з вучэбнай мэтай, але і для далучэння студэнтаў, асабліва старшых курсаў, да навуковых даследаванняў. Такім чынам ужо у сценах універсітэта студэнты атрымліваюць самыя шырокія магчымасці для навуковага пошуку, удзельнічаюць у рэалізацыі сваіх даследаванняў на практыцы.

Паказальна, што на сённяшні дзень 40 працэнтаў выпускнікоў выконваюць дыпломныя работы па тэмах навукова-даследчых інстытутаў, розных спецыяльных канструктарскіх бюро (СКБ).

Калектывы выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і студэнтаў шырока прыцягваюцца да выканання работ на дагаворных пачатках. У мінулым годзе, напрыклад, аб'ём такіх работ перавысіў мільён рублёў.

Пачуццё глыбокага задавальнення выклікае тое, што нашы выхаванцы працуюць у важнейшых галінах навукі і тэхнікі, якія забяспечваюць дасягненні тэхнічны прагрэс народнай гаспадаркі краіны. І разам з тым мы разумеем усю паўнату адказнасці за падрыхтоўку не толькі высококваліфікаваных маладых вучоных, якія глыбока ведаюць і любяць сваю прафесію, але і за выхаванне надзейных будаўнікоў камунізма, узброеных перадавой марксісцка-ленінскай тэорыяй, гарачых патрыётаў нашай вялікай Радзімы.

І. ЗЯЦЬКОЎ,
дэкан фізічнага факультэта, дацэнт.

ФІЛАЛАГІЧНЫ

Філалагічны факультэт пачатак сваёй гісторыі бярэ з 1922 года, з моманту арганізацыі літаратурна-лінгвістычнага аддзялення пры педфаку БДУ. Можна з поўнай адказнасцю сцвярджаць, што філфаку належыць рашаючая роля у развіцці беларускай філалагічнай навукі. За ўсе гады свайго існавання ён падрыхтаваў тысячы высококваліфікаваных спецыялістаў, многія з якіх сталі буйнейшымі вучонымі, пісьменнікамі, дзеячамі народнай адукацыі і беларускай нацыянальнай культуры. Для прыкладу зазначым, што толькі за пасляваенныя гады факультэт падрыхтаваў каля 3500 спецыялістаў у галіне беларускай і рускай філалогіі, звыш 100 дактароў і кандыдатаў філалагічных навук, 50 выпускнікоў сталі членамі Саюза пісьменнікаў БССР.

Цяпер на стацыянары і вячэрнім аддзяленні факультэта займаецца 1607 студэнтаў. На 8 яго кафедрах працуюць вядомыя вучоныя-філолагі, сярод якіх 10 прафесараў і дактароў навук.

На факультэце вядзецца падрыхтоўка кадраў па дзвюх спецыяльнасцях: беларускай і рускай мове і літаратуры і рускай мове і літаратуры. Паралельна з чытаннем лекцый па філалагічных агульнаадукацыйных дысцыплінах з трэцяга курса уводзяцца спецыялізаваныя заняткі у семінарах з тым разлікам, каб праца студэнтаў у іх заканчвалася напісаннем дыпломных работ. Кіруюць такімі заняткамі, як правіла, вядучыя вучоныя: прафесары М. Г. Булахаў, М. А. Жыдовіч, М. Р. Ларчанка, А. А. Лойка, І. Я. Навуменка, А. Я. Супрун, Л. І. Фіглоўская, Л. М. Шакун, дацэнты П. П. Шуба, Б. П. Мицкевіч, Н. С. Гілевіч, В. В. Казлова, І. П. Кахно і некаторыя іншыя.

Філалагічны факультэт падтрымлівае цесныя сувязі з многімі універсітэтамі Савецкага Саюза (напрыклад, з МДУ імя Ламаносава, Вільнюскім, Ленінградскім), а таксама з многімі вышэйшымі навучальнымі установамі зарубежных краін — Іенскім універсітэтам (ГДР), Варшаўскім універсітэтам і Кракаўскай вышэйшай педагагічнай школай (ПНР), з Сафійскім універсітэтам (БНР), з Любляпскім універсітэтам (Югаславія). Штогод студэнты-філолагі і навуковыя работнікі выязджаюць у названыя вышэй краіны, дзе удасканальваюць свае веды па балгарскай, славенскай, польскай і нямецкай мовах. У сваю чаргу філфак прымае студэнтаў і выкладчыкаў з Польшчы, ГДР, Балгарыі, Югаславіі і ЧССР.

Пры кожнай кафедры філалагічнага факультэта створаны студэнцкія навуковыя гурткі, у якіх займаецца каля 700 чалавек. Лепшыя навуковыя работы маладых даследчыкаў прадстаўляюцца на рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых прац. У адпаведнасці з існуючымі дагаворамі многія студэнты штогод выязджаюць з дакладамі ў іншыя краіны. Акрамя таго, на факультэце працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці, а таксама разнастайныя спартыўныя секцыі.

У. ЛАЗОЎСКІ,
намеснік дэкана, дацэнт.

НА ЗДЫМКУ: першы урок. З яго пачынае шлях кожны настаўнік. Вядома, хвалюецца і студэнтка філфака Зоя Хрышчановіч.

Добрыя веды, атрыманыя ва універсітэце, імкненне авалодаць педагагічным майстэрствам і карысныя парады старэйшых таварышаў дапамагли практыкантцы з поспехам правесці першыя заняткі.

Фота П. НІКІЦІНА.

ЮРЫДЫЧНЫ

Юрыдычны факультэт рыхтуе юрыстаў шырокага профілю для работы у органах суда, пракуратуры, следства, дазнання, адвакатуры, натарыята, а таксама юрысконсультамі дзяржаўных і грамадскіх органаў, арганізацый і прадпрыемстваў Беларускай ССР.

Тэрмін навучання 5 год. Студэнты вывучаюць гісторыю КПСС, палітычную эканомію, марксісцка-ленінскую філасофію, навуковы камунізм, логіку, тэорыю дзяржавы і права, гісторыю дзяржавы і права СССР і БССР і зарубежных дзяржаў, гісторыю палітычных вучэнняў, дзяржаўнае права СССР, зарубежных сацыялістычных краін і буржуазных дзяржаў, крымінальнае, грамадзянскае, працоўнае, адміністрацыйнае, фінансавае, зямельнае, калгаснае, выпраўленча-працоўнае і міжнароднае права, крымінальны і грамадзянскі працэс, крыміналістыку, крыміналогію, замежную мову, судовую статыстыку, судовую псіхалогію і іншыя дысцыпліны. З трэцяга курса студэнты праходзяць адну з наступных спецыялізацый: следча - судова - пракурорскую, дзяржаўна-прававую або гаспадарча-прававую. На пятым годзе вучобы прадугледжана чатырохмесячная вытворчая практыка.

Навучанне заканчваецца абаронай дыпломнай работы і дзяржаўнымі экзаменамі па палітычнай эканоміі, тэорыі дзяржавы і права і спецыялізацыі (крымінальнаму, дзяржаўнаму або грамадзянскаму праву СССР).

Вучэбную і навуковую работу на факультэце вядуць факультэцкія кафедры тэорыі дзяржавы і права, гісторыі дзяржавы і права, дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, грамадзянскага права і працэсу, крымінальнага права, крымінальнага працэсу, крыміналістыкі, а таксама навукова-педагагічныя работнікі агульнаўніверсітэцкіх кафедр гісторыі КПСС, маркісцка-ленінскай філасофіі, палітычнай эканоміі, гісторыі філасофіі і логікі, замежных моў і фізічнага выхавання. Да навуковай работы кафедр далучаюцца студэнты.

На юрыдычным факультэце працуе аддзяленне палітэканоміі. На гэтым аддзяленні рыхтуюцца выкладчыкі палітычнай эканоміі і грамадазнаўства для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і агульнаадукацыйных школ.

На спецыяльнасці правазнаўства і палітэканомія прымаюцца, як правіла, асобы, якія маюць двухгадовы працоўны стаж. Для асоб, якія не маюць такога стажу, выдзяляецца не больш 20 працэнтаў планавых месц.

В. ШКУРКО,
дэкан юрыдычнага факультэта, дацэнт.

МАТЭМАТЫЧНЫ

Сучасная матэматыка з'яўляецца адным з велічных і непераходзячых дасягненняў чалавечага розуму. Сацэйнічаючы развіццю іншых навук і тэхнічнаму прагрэсу, матэматыка пастаянна абнауляе свой змест, узбагачаецца новымі метадамі і новай праблематыкай.

Своеасаблівай рысай развіцця сучаснай навукі і тэхнікі з'яўляецца узрастаючая роля матэматычных метадаў даследавання. У наш час цяжка назваць галіну навукі і тэхнікі, у якой не прымяняецца матэматыка. Вялікі тэхнічны прагрэс у нашай краіне і поспехі у асваенні касмічнай прасторы былі б немагчымы без выкарыстання сучасных дасягненняў матэматыкі.

Паспяховае развіццё вылічальнай тэхнікі рэзка павялічыла маштабы прымянення матэматычных метадаў. У нашай рэспубліцы найбольш кваліфікаваныя кадры па матэматыцы рыхтуе матэматычны факультэт БДУ. За гады вучобы студэнты не толькі атрымліваюць неабходны аб'ем сучасных ведаў, але і прывучаюцца да самастойнай навукова-даследчай работы.

Выпускнікі факультэта накіроўваюцца на працу ў навуковыя ўстановы, у вылічальныя цэнтры, у вышэйшыя навучальныя установы і сярэднія школы.

На матэматычным факультэце працуюць відныя вучоныя: Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік АН БССР М. П. Яругін, акадэмікі АН БССР Ф. Д. Гахаў, У. І. Крылоў, член-карэспандэнт АН БССР, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола У. П. Платонаў, член-карэспандэнт АН БССР У. Г. Спрынджук, дактары фізіка-матэматычных навук Ю. С. Багданаў, В. І. Вядзернікаў, Р. Ф. Габасаў, Ф. М. Кірылава, І. А. Прусаў, А. Х. Турэцкі і каля 30 кандыдатаў фізіка-матэматычных навук.

Навукова-даследчая работа вядзецца ў галіне алгебры і тапалогіі, метадаў вылічэнняў, звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў, краявых задач тэорыі аналітычных функцый, дыферэнцыяльнай геаметрыі, канструктыўнай тэорыі функцый і іншых.

Вылічальны цэнтр вядзе навуковую работу у галіне вылічальнай матэматыкі і рашае практычныя задачы для патрэб народнай гаспадаркі.

А. ГУСАК,
дэкан матэматычнага факультэта, дацэнт.

ГІСТАРЫЧНЫ

Гістарычны факультэт складаецца з двух аддзяленняў — гістарычнага і філасофскага. На трох формах навучання (дзённай, вячэрняй, завочнай) вядзецца падрыхтоўка настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства для сярэдніх школ (на аддзяленні гісторыі) і выкладчыкаў грамадазнаўства, асноў навуковага атэізму для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Выпускнікі, праявіўшыя здольнасці да самастойнай навуковай работы, залічваюцца у аспірантуру або накіроўваюцца на работу ў навукова-даследчыя ўстановы.

На факультэце праводзяць вучэбна-выхаваўчую і навуковую работу, арганізуюць вучэбную і вытворчую практыку студэнтаў кафедры гісторыі СССР, гісторыі БССР, новай і навейшай гісторыі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, а таксама агульнаўніверсітэцкія кафедры.

Высококваліфікаваны спецыялісты — прафесары, дацэнты, старшыя выкладчыкі, сярод якіх прафесар Ф. М. Нячай, прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР Л. С. Абецэдарскі, прафесары Л. М. Шнеерсон, Г. М. Трухноў, Г. М. Ліўшыц — чытаюць лекцыі па агульных і спецыяльных курсах, праводзяць практычныя заняткі і спецсеміпары. Агульныя курсы і спецкурсы чытаюць таксама члены агульнаўніверсітэцкіх кафедр, у тым ліку члены-карэспандэнты АН БССР, прафесары В. І. Сцяпанаў, І. М. Ігнаценка, І. М. Лушчыцкі, У. М. Сікорскі, М. Я. Шкляр, Р. А. Левін.

Для самастойнай работы ў распараджэнні студэнтаў кабінеты гісторыі СССР і БССР, усеагульнай гісторыі, а таксама гісторыка-археалагічны музей.

У кабінетах і музеі ёсць навуковая і вучэбная літаратура, бібліяграфічныя ўказальнікі, арыгінальныя археалагічныя, этнаграфічныя, нумізматычныя экспанаты і матэрыялы, якія характарызуюць гісторыю і культуру народаў старажытнага Усходу, старажытнай Грэцыі і Рыма. Там жа праводзяцца кансультацыі, дэманструюцца вучэбныя фільмы.

За час навучання студэнты праходзяць розныя віды практыкі: педагагічную ў школах і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, археалагічную і этнаграфічную ў навуковых экспедыцыях, піянерскую ў піянерскіх лагерах, музейную, архіўную і бібліяграфічную ў музеях, а на пятым курсе выконваюць дыпломную работу і здаюць дзяржаўныя экзамены.

На факультэце здзяйсняецца спецыялізацыя студэнтаў па важнейшых напрамках і раздзелах гістарычнай і філасофскай навук — гісторыі СССР, гісторыі БССР, гісторыі КПСС, навуковаму атэізму, новай і навейшай гісторыі (для студэнтаў аддзялення гісторыі), філасофіі і прыродазнаўчых навуках, філасофіі і грамадскіх навуках (для студэнтаў аддзялення філасофіі).

Вялікае месца ў спецыяльнай падрыхтоўцы і ідэйным выхаванні студэнтаў займае студэнцкая навукова-даследчая работа. Штогод студэнты факультэта выступаюць ва універсітэце з дакладамі на традыцыйных навуковых канферэнцыях, выязджаюць з дакладамі ў вну Ленінграда, Масквы, Кіева, Вільнюса, Рыгі, Львова і іншых гарадоў краіны.

Дэканат, партыйнае бюро і грамадскія кафедры вялікую ўвагу удзяляюць развіццю студэнцкай мастацкай самадзейнасці.

П. САВАЧКІН,
дэкан гістарычнага факультэта, дацэнт.

ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ

Да апошняга часу электронныя вылічальныя машыны (ЭВМ) выкарыстоўваліся у асноўным толькі акадэміямі навук, буйнейшымі навукова-даследчымі інстытутамі і прамысловымі прадпрыемствамі. У сувязі з няспынным ростам парка ЭВМ павялічваецца і колькасць іх спажыўцоў. Цяпер ЭВМ выкарыстоўваюцца ў вылічальных цэнтрах (ВЦ) многіх прадпрыемстваў і галіновых органаў кіравання.

Прадугледжваецца, што ў недалёкім будучым для арацоўкі інфармацыі і кіравання прадпрыемствамі, адміністрацыйнымі раёнамі, рознымі галінамі народнай гаспадаркі з пакуль што разрозненых ВЦ будзе створана адзіная сетка іх, прызначаная для ўсямернага павышэння эфектыўнасці вытворчасці і стварэння аптымальнага рэжыму кіравання.

Аднак простае павелічэнне колькасці ЭВМ не можа рашыць гэтай задачы. Для паўнацэннага выкарыстання ЭВМ неабходны спецыялісты-матэматыкі, здольныя працаваць у галіне матэматычнага забеспячэння ЭВМ. На іх ускладаецца абавязак аблягчаць і паскараць працэс праграмірования для ЭВМ шляхам распрацоўкі алгарытмічных моў, спецыяльных транслятараў, стандартных праграм і г. д. Між тым вострая неабходнасць у такіх спецыялістах адчуваецца ўжо цяпер.

З мэтай ліквідавання разрыву паміж вытворчасцю ЭВМ і іх выкарыстаннем у апошнія гады па рашэнню партыі і ўрада у некалькіх вядучых навучальных установах краіны былі створаны факультэты прыкладной матэматыкі, прызваныя рыхтаваць матэматыкаў — спецыялістаў у галіне прымянення вылічальнай тэхнікі, матэматычнага забеспячэння ЭВМ і матэматычнага забеспячэння аўтаматычных сістэм упраўлення (АСУ). Такі факультэт створан і у нашым універсітэце і красавіка 1970 года. Цяпер яго аснову складаюць кафедры вылічальнай матэматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў і прыкладной матэматыкі, на якіх працуюць такія вядомыя матэматыкі, як Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік АН БССР М. П. Яругін, акадэмік АН БССР У. І. Крылоў, дактары навук Ф. М. Кірылава, Р. Ф. Габасаў і іншыя.

У гэтым годзе на першы курс факультэта прыкладной матэматыкі будзе прынята 150 чалавек.

Мы запрашаем выпускнікоў сярэдніх школ — выдатнікаў вучобы і таленавітую моладзь, якія жадаюць авалодаць асновамі навукі кіравання, на наш факультэт!

Е. ІВАНОЎ,
дэкан факультэта прыкладной матэматыкі, доктар фізіка-матэматычных навук.

ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

З мэтай павышэння узроўню агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі рабочай і сельскай моладзі і стварэння ей неабходных умоў для паступлення у вну арганізаваны падрыхтоўчыя аддзяленні. На іх прымаюцца асобы з закончанай сярэдняй адукацыяй з ліку перадавых рабочых, калгаснікаў і дэмабілізаваных з радоў Узброеных Сіл СССР. Паступаючыя на падрыхтоўчае аддзяленне павінны мець стаж практычнай работы не менш 1 года.

Адбор і накіраванне моладзі на гэтыя аддзяленні ажыццяўляецца непасрэдна кіраўнікамі прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, арганізацый транспарту і сувязі, саўгасаў, калгасаў, камандаваннем вайсковых часцей па рэкамендацыі партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый.

Залічэнне на падрыхтоўчае аддзяленне праводзіцца з адрывам ад вытворчасці — 8 месяцаў, без адрыву ад вытворчасці — 10 месяцаў. Іншагароднія слухачы, якія вучацца з адрывам ад вытворчасці, забяспечваюцца інтэрнатам, ім выплачваецца стыпендыя або вышэйшай навучальнай установай, пры якой адкрыта падрыхтоўчае аддзяленне, або прадпрыемствам, калгасам, саўгасам.

Заняткі праводзяцца, у асноўным, па дысцыплінах, па якіх прадугледжаны уступныя экзамены пры прыёме у вну.

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення па заканчэнні навучання здаюць выпускныя экзамены. Тыя, хто паспяхова вытрымаў іх, залічваюцца на першы курс данай вну або іншых вну, для якіх ажыццяўлялася падрыхтоўка на гэтым аддзяленні, без экзаменаў.

На падрыхтоўчым аддзяленні універсітэта у гэтым навучальным годзе займаецца 100 чалавек — 50 на дзённай і 50 на вячэрняй формах навучання. Падрыхтоўка вядзецца па наступных спецыяльнасцях: фізіка, матэматыка, хімія і біялогія.

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення карыстаюцца аўдыторыямі, кабінетамі, лабараторыямі, бібліятэкамі і іншымі вучэбна-дапаможнымі службамі універсітэта.

Вучэбную работу са слухачамі вядуць лепшыя выкладчыкі універсітэта, якія маюць вялікі педагагічны стаж.

М. ГАРОШКА,
загадчык падрыхтоўчага аддзялення.

Па усей рэспублiцы iдзе слава пра універсiтэцкiя калектывы мастацкай самадзейнасцi — народную харавую капэлу, народны аркестр народных iнструментаў, народны ансамбль танца «Крыжачок» і іншыя. Iм шчыра апладзіруюць гледачы у час гастрольных падарожжаў па краіне і за мяжой.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

З ПРАВІЛ ПРЫЁМУ

Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна прымае студэнтаў адпаведна з правіламі прыёму у вышэйшыя навучальныя установы СССР.

На вучобу з адрывам ад вытворчасці (дзённае аддзяленне) на наступныя факультэты па спецыяльнасцях:

Фізічны — спецыяльнасці: фізіка, радыёфізіка і электроніка.

Матэматычны — спецыяльнасць матэматыка.

Прыкладной матэматыкі—спецыяльнасць прыкладная матэматыка.

Хімічны—спецыяльнасць хімія.

Біялагічны—спецыяльнасць біялогія.

Геаграфічны — спецыяльнасць геаграфія.

Гістарычны—спецыяльнасці: гісторыя, філасофія.

Юрыдычны—спецыяльнасці: правазнаўства, палітэканомія.

Філалагічны—спецыяльнасці: беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура.

Журналістыкі—спецыяльнасць журналістыка.

На вучобу без адрыву ад вытворчасці **на вячэрняе аддзяленне па спецыяльнасцях:** гісторыя, матэматыка, фізіка, радыёфізіка і электроніка, хімія, правазнаўства, біялогія, геаграфія, філасофія, руская мова і літаратура, беларуская і руская мова і літаратура; **на завочны факультэт па спецыяльнасцях:** гісторыя, філасофія, правазнаўства, матэматыка, геаграфія, біялогія, руская мова і літаратура, беларуская і руская мова і літаратура.

УМОВЫ ПРЫЁМУ

I. У Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна прымаюцца грамадзяне СССР абодвух полаў, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю, на дзённае навучанне ва узросце да 35 год, а на завочнае і вячэрняе навучанне — без абмежавання ўзросту, пасяхова здаўшыя ўступныя экзамены, шляхам конкурснага адбору найбольш дастойных, падрыхтаваных і здольных людзей, прадстаўшых станоўчыя характарыстыкі для паступлення ва універсітэт.

II. Пераважным правам пры залічэнні карыстаюцца асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух год, пацверджаны запісам у працоўнай кнізцы.

Стаж практычнай работы вылічаецца на пачатак навучальнага года на сукупнасці, незалежна ад перарывау у рабоце. У стаж залічваецца таксама час знаходжання на ваеннай службе.

Для членаў калгаса стаж практычнай работы вызначаецца на аснове запісу у працоўнай кнізцы калгасніка аб выпрацоўцы установленага для данага калгаса мінімуму працадзён за кожны каляндарны год у калгасе.

III. Пры прыёме заяу ва універсітэт улічваецца наступнае:

а) закончыушыя сярэднія навучальныя установы і тэхнічныя вучылішчы прымаюцца на дзённае навучанне, калі яны маюць трохгадовы практычны стаж на заканчэнні вучэбнай установы. Указаны стаж не патрабуецца ад асоб, уключаных у 5% выпуску сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы, а таксама ад асоб, атрымаушых сярэднюю спецыяльную адукацыю без адрыву ад вытворчасці.

Закончыушыя прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя установы і маючыя закончаную сярэднюю адукацыю прымаюцца на дзённае навучанне пры наяўнасці у іх стажу практычнай работы у адпаведнасці з дзейнічаючым заканадаўствам;

б) на спецыяльнасці: журналістыка, правазнаўства, філасофія, палітэканомія прымаюцца на дзённае навучанне, як правіла, асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух год, пры гэтым на спецыяльнасць журналістыка прымаюцца асобы, праявіушыя здольнасці у літаратурнай дзейнасці. На завочнае навучанне на спецыяльнасці біялогія прымаюцца асобы, якія маюць закончаную сярэднюю спецыяльную адукацыю або працуюць на выбранай спецыяльнасці.

ПАРАДАК ПРЫЁМУ

IV. Заявы аб прыёме падаюцца паступаючымі на імя рэктара універсітэта па адзінай форме.

Да заявы прыкладаюцца:

дакумент аб сярэдняй адукацыі (у арыгінале),

характарыстыка для паступления ва універсітэт,

медыцынская даведка (форма 286),

4 фотакарткі (здымкі без галаўнога убору, размерам 3×4 см).

З прыбыццём ва універсітэт паступаючы прад'яўляе асабіста пашпарт, ваенны білет (ваеннаабавязаныя запасу) або прыпісное пасведчанне (асобы прызыўнога узросту).

Паступаючыя прадстаўляюць характарыстыку з апошняга месца работы, выдадзеную партыйнымі, камсамольскімі, прафсаюзнымі і іншымі грамадскімі арганізацыямі, кіраўнікамі прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, праўленнямі калгасаў, а выпускнікі агульнаадукацыйных школ — кіраўнікамі і грамадскімі арганізацыямі школ. Дэмабілізаваныя з Узброеных Сіл СССР прадстаўляюць ва універсітэт характарыстыкі ад камандавання воінскай часці.

Асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух год, і тыя, хто накіраваны на вучобу з адрывам ад вытворчасці, а таксама паступаючыя вучыцца без адрыву ад вытворчасці на спецыяльнасці, адпавядаючыя характару іх работы ў народнай гаспадарцы, пры падачы заявы павінны прадставіць завераную кіраўнікамі прадпрыемства або установы выпіску з працоўнай або працоўнай кнізкі калгасніка.

Залічаныя на вучобу з адрывам ад вытворчасці да пачатку навучальнага года абавязаны прадставіць у арыгінале дакумент, які пацвярджае стаж работы.

V. Прыём заяу ад паступаючых ва універсітэт, правядзенне ўступных экзаменаў, а таксама залічэнне ў састаў студэнтаў праводзіцца у наступныя тэрміны:

НА ДЗЁННАЕ НАВУЧАННЕ:

прыём заяў — з 20 чэрвеня па 31 ліпеня,

уступныя экзамены—з 1 па 20 жніуня,

залічэнне у састаў студэнтаў—з 21 па 25 жніуня.

НА ВЯЧЭРНЯЕ НАВУЧАННЕ:

прыём заяў — з 20 чэрвеня па 31 ліпеня,

уступныя экзамены — з 1 па 20 жніуня,

залічэнне у састаў студэнтаў —з 21 па 25 жніуня.

УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

VI. Паступаючыя ва універсітэт здаюць уступныя экзамены ў залежнасці ад выбранай спецыяльнасці па наступных прафіліруючых дысцыплінах:

на спецыяльнасць **беларуская і руская мова і літаратура** — рускай мове і літаратуры (пісьмова), беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна);

на спецыяльнасць **руская мова і літаратура**—рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна);

на спецыяльнасць **журналістыка** — рускай мове і літаратуры або (на жаданню паступаючага) беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна);

на спецыяльнасці **гісторыя, філасофія, правазнаўства** — рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна) як на непрафіліруючай дысцыпліне. Пры гэтым паступаючыя на даныя спецыяльнасці могуць быць вызвалены ад здачы уступнага экзамена на замежнай мове, калі яны не вывучалі яе у сярэдняй навучальнай установе або вывучалі ў аб'ёме праграмы няпоўнай сярэдняй школы;

на спецыяльнасці **фізіка, матэматыка, прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка** — матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы (вусна);

на спецыяльнасць **хімія**— хіміі (вусна), матэматыцы (пісьмова), фізіцы (вусна);

на спецыяльнасць **біялогія** — біялогіі (вусна), хіміі (вусна), фізіцы (пісьмова); на спецыяльнасці **геаграфія і палітычная эканомія**—матэматыцы (пісьмова), геаграфіі (вусна), гісторыі СССР (вусна).

Паступаючыя на завочную форму навучання здаюць тыя ж уступныя экзамены, што і на дзённую форму навучання, акрамя паступаючых на спецыяльнасці біялогія і геаграфія. Паступаючыя на гэтыя спецыяльнасці замест пісьмовага экзамена па фізіцы і матэматыцы здаюць вусны экзамен па гэтых прадметах.

Заўвагі да пункта VI. Узнагароджаныя па заканчэнні сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалем або закончыушыя сярэднюю спецыяльную навучальную установу з дыпломам выдатніка здаюць устаноўленыя экзамены па адной з прафіліруючых дысцыплін, а іменна: паступаючыя на спецыяльнасць беларуская і руская мова і літаратура—беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна); на спецыяльнасць руская мова і літаратура—рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна) або (на жаданню паступаючага) беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна); на спецыяльнасці фізіка, радыёфізіка і электроніка — фізіцы (вусна); на спецыяльнасці матэматыка і прыкладная матэматыка — матэматыцы (пісьмова і вусна); на спецыяльнасць геаграфія — геаграфіі (вусна); на спецыяльнасць хімія — хіміі (вусна); на спецыяльнасць біялогія — біялогіі (вусна); на спецыяльнасці гісторыя, правазнаўства, філасофія — гісторыі СССР (вусна); на спецыяльнасці палітычная эканомія — матэматыцы (пісьмова).

Пры здачы экзамена (як пісьмовага, так і вуснага) па гэтых дысцыплінах з адзнакай «5» яны вызваляюцца ад далейшай здачы уступных экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «4» або «3» здаюць экзамены на усіх адпаведных дысцыплінах.

VII. Усе паступаючыя ва універсітэт на спецыяльнасці радыёфізіка і электроніка, матэматыка, фізіка, хімія, біялогія, палітэканомія і геаграфія здаюць уступныя экзамены па рускай мове і літаратуры (сачыненне) як непрафіліруючай дысцыпліне.

Асобы, вывучаўшыя у сярэдняй навучальнай установе рускую мову у аб'ёме праграмы нацыянальнай школы, могуць пісаць замест сачынення ізлажэнне або дыктант.

VIII. Уступныя экзамены праводзяцца па праграмах, зацверджаных Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР у адпаведнасці з праграмамі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

IX. Асобам, дапушчаным да уступных экзаменаў ва універсітэт, прадастаўляецца ва ўстаноўленым парадку дадатковы водпуск 15 каляндарных дзён (не улічваючы час на праезд ва універсітэт і назад) па месцы работы без захавання платы.

X. Не з'явіушыяся без уважлівых прычын на адзін з экзаменаў у назначаны па раскладу тэрмін да паступных экзаменаў не дапускаюцца.

XI. Асобы, атрымаушыя нездавальняючую адзнаку па адным з прадметаў, да паступных экзаменаў не дапускаюцца.

Пераздача экзаменаў з мэтай павышэння адзнакі не дазваляецца.

Спецыяльны выпуск для абітурыентаў падрыхтаваны прыёмнай камісіяй.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 572. АТ 22662